8. Игнатенко И. М. Беднейшее крестьянство — союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии (1917—1918 гг.).— Мн.: Изд-во Министерства высшего, среднего специального и профессионального образования БССР, 1962.— С. 116.

УДК 947.6 «19»

П. В. Дзядзюля, дацэнт

# КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ГРАМАДСКІХ РУХАЎ І АБ'ЯДНАННЯЎ НА ПАЧАТКУ XX СТ.

The articl dwells upon the process of the rise and activities of peasant organizations in Belarus ofter the victory of February revolution.

Адмена прыгону паскорыла працэс развіцця капіталістычных адносін у Расійскай імперыі. Упоравень з іншымі развітымі рэгіёнамі Расіі ўцягваліся ў новыя гаспадарчыя сувязі і пяць губерняў Паўночна-Заходняга краю. Будаўніцтва чыгунак, шасейных дарог, добрыя рачныя камунікацыі, блізкасць Заходняй Еўропы стымулявалі тут развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі і садзейнічалі фарміраванню краёвага рынку. Адначасова расла патрэбнасць у кваліфікаваных рабочых, спецыялістах з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй.

Царскі ўрад, праводзячы на Беларусі палітыку русіфікацыі, не задаволіў просьбу мясцовых улад і груп інтэлігенцыі аб адкрыцці універсітэта ў адным з гарадоў краю. Але ён быў вымушаны пашыраць пачатковую адукацыю, для якой былі патрэбны настаўнікі. За перыяд з 1864 па 1909 г. у Заходне-Паўночным рэгіёне царскай імперыі пачынаюць дзейнасць Маладзечанская, Полацкая, Нясвіжская, Свіслацкая, Панявежская, Нова-Вілейская, Рагачоўская настаўніцкія семінарыі; Віленскі, Віцебскі, Магілёўскі, Мінскі настаўніцкія інстытуты. Выхадцы з Беларусі вучацца ва універсітэтах, інстытутах, акадэміях у Пецярбургу, Маскве, Тарту, Кіеве, Варшаве і іншых гарадах.

У беларускай нацыі не было выразніка яе інтарэсаў, а ў інтэлігенцыі, якая толькі што пачала выходзіць у свет,— свайго цэнтра. Інтэлігенты пачынаюць шукаць арганізацыйныя формы работы на карысць краю. Яшчэ маладасведчаныя ў тэорыі і практыцы грамадскай работы, яны вучацца ў суседзяў: украінцаў, палякаў, яўрэяў, літоўцаў, у якіх рост нацыянальнай самасвядомасці пачаўся раней і адбываўся больш інтэнсіўна. Варта адзначыць, што і пэўная частка рускай інтэлігенцыі спачувала беларусам у іх імкненні стварыць нацыянальныя арганізацыйныя структуры адраджэння.

На Беларусі па розных прычынах у канцы XIX і пачатку XX ст. апынулася значная колькасць адукаваных спецыялістаў з Расіі. Гэта былі не толькі чыноўнікі каланіяльнага па сутнасці дзяржаўнага апарату, шавіністы розных адценняў, але і людзі прагрэсіўных поглядаў, сапраўдныя асветнікі, што засвоілі дэмакратычныя традыцыі многіх пакаленняў змагароў супраць дэспатызму. Сярод іх былі настаўнікі, медыцынскія работнікі, аграномы, журналісты і інш.

Яшчэ 19 лістапада 1898 г. у Мінску па ініцыятыве вядомага рускага пісьменніка Я. М. Чырыкава, якога жыццёвыя хвалі закінулі на Беларусь, ствараецца «Таварыства аматараў прыгонных мастацтваў». Гэта была грамадская культурна-асветніцкая і літаратурна-мастацкая арганізацыя ліберальна-дэмакратычнага накірунку. Паводле статута, яна мела на мэце «служыць збліжэнню мясцовых дзеячаў у галіне мясцовых мастацтваў і асоб, якія спачуваюць ім, садзейнічаць развіццю і распаўсюджванню мастацтваў у Мінску» [I].

З гэтай мэтай таварыства планавала правядзенне аматарскіх спектакляў, канцэртаў, літаратурных і музычных вечароў, стварэнне бібліятэк, студый і майстэрань выяўленчага мастацтва, а пры наяўнасці сродкаў — школ вапісу, скульптуры, музыкі, дэкламацыі і сучаснага майстэрства, арганізацыі выдання кніг і часопісаў. Мела літаратурную, тэатральна-драматычную, музычную і мастацкую секцыі. Члены таварыства наладжвалі лекцыі, дыспуты, слухалі рэфераты пра творчасць еўрапейскіх, рускіх пісьменнікаў, арганізоўвалі спектаклі. У тых умовах гэтая дзейнасць развівалася ў кантэксце рускай традыцыі і выконвала задачу русіфікацыі краю. І ў той жа час культурная праца ў шырокім дыяпазоне закранала многія слаі грамадскасці горада, знаёміла мінчан з перадавымі ідэямі таго часу, уводзіла ва ўжытак беларускія фальклорныя матывы.

Напярэдадні і ў час рэвалюцыі 1905—1907 гг. арганізатары і ўдзельнікі культурнага працэсу, шматлікія іх прыхільнікі прынялі актыўны ўдзел у антыўрадавых акцыях, што прывяло да палітычных рэпрэсій, а пасля і да прыпынення дзейнасці таварыства ў 1906 г. па загаду губернатара Курлова.

У культурна-асветніцкім накірунку дзейнічала з 1901 г. ў Мінску таварыства аховы жанчын, якое заснаваў гарадскі галава К. Э. Чапскі і якое знаходзілася пад уплывам дзеячаў ліберальна-апазіцыйнага руху. Дыяпазон дзейнасці таварыства быў даволі шырокі. Юрыдычныя кансультацыі, лекцыі па гігіене, астраноміі, гісторыі, літаратуры. Працавалі нядзельныя школы, прытулак для дзяцей рабочых [2 ].

Аналагічныя таварыствы, як сведчанне нарастаючай грамадскай актыўнасці, распаўсюджвання адукацыі, цікавасці да дасягненняў айчыннай і сусветнай культуры, узнікаюць у канцы XIX—пачатку XX ст. у Гродне, Віцебску, Магілёве і іншых гарадах.

Традыцыйным цэнтрам беларускай культуры, асветы ў гэты час заставалася Вільня. На пачатку XX ст. тут працавалі шматлікія навуковыя, культурна-асветніцкія саюзы, таварыствы, гурткі. У 1903 г. узнік педагагічны музей пры Віленскай навуковай акрузе, якім кіравала грамадская камісія, а ў 1907 г. у горадзе пачаў дзейнічаць Беларускі настаўніцкі саюз, які ставіў на мэце арганізацыю нацыянальных школ. У гэтым жа годзе ўзнікла польскае таварыства прыяцеляў навук, члены якога вывучалі беларускую народную культуру, збіралі беларускі фальклор Віленшчыны. У Вільні наладжваліся беларускія вечары і вечарынкі, на якіх выступалі першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага, беларускі музычна-драматычны гурток.

Як вядома, тут з 1906 г. выдаваліся першыя беларускія легальныя газеты «Наша доля», «Наша ніва», пазней часопіс «Саха», якія гуртавалі вакол сябе шматлікі карэспандэнцкі актыў. Адначасова працавалі беларускае выдавецкае таварыства, суполка «Наша хата», друкарня М. Кухты, першая беларуская кнігарня і іншыя [3].

Капіталізацыя прамысловасці, сельскай гаспадаркі на Беларусі разбурала архаічныя формы працы і спараджала масавае беспрацоўе. У пошуках сродкаў для жыцця найбольш дзеяздольныя маладыя беларусы былі вымушаны шукаць працу ў адносна развітых прамысловых рэгіёнах Расійскай імперыі і нават з'язджаць у краіны Заходняй Еўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі.

Статыстыка таго часу сведчыць, што на мяжы стагоддзяў, напрыклад, у Пецярбургу і ў яго прыгарадах жыло 3230 чалавек, якія лічылі беларускую мову роднай, 70 % з іх складалі людзі праваслаўнага, а 30 % каталіцкага веравызнання. Апошнія і былі актывам беларускага культурна-асветніцкага руху. І справа тут не ў рэлігіі, а ў адчуванні і разуменні нацыянальна-вызваленчага руху палякаў не толькі ў карэннай Польшчы, але і ў Пецярбургу [4].

Грамадска-палітычная, культурная атмасфера Пецярбурга, яго еўрапейскасць прыцягвалі да сябе прадстаўнікоў розных народаў Расіі. Выхадцы з Паўночна-Заходняга краю, не маючы магчымасці праявіць сваю нацыянальную адметнасць у творчасці на Радзіме пад прэсам надзвычайных законаў царскага ўрада, знаходзілі ў паўночнай сталіцы для гэтага спрыяльныя ўмовы. Невыпадкова культурна-асветніцкая дзейнасць у Пецярбургу стала часткай усяго рускага нацыянальна-вызваленчага руху на этапе барацьбы за адраджэнне ў перадрэвалюцыйны час. Менавіта тут яшчэ ў 1881 г. узнік гурток беларусаў-нарадавольцаў «Гоман», які выдаў два нумары часопіса пад такой жа назвай. У часопісе ўпершыню ў гісторыі навейшай айчыннай грамадскай думкі абгрунтоўвалася ідэя пра існаванне беларускай нацыі, падкрэслівалася задача фарміравання народнай інтэлігенцыі [5].

У 1889—1893 гг. у Пецярбургу працаваў «Гурток моладзі польска-літоўска-беларускай і маларускай». Аб'ядноўваў пераважна студэнтаў тэхналагічнага інстытута, якія займаліся асветніцтвам. Распаўсюджвалі сярод рабочых і сялян літаратуру, вучылі грамаце непісьменных. Паступова ва ўмовах развіцця рэвалюцыйнага руху гурток эвалюцыяніраваў да палітычнага [6].

Больш шырокі абсяг дзейнасці мела культурна-асветніцкая арганізацыя «Круг беларускай асветы і культуры», якая існавала ў Пецярбургу ў 1902—1904 гг. У яе ўваходзілі Іваноўскі, браты Луцкевічы, беларускія студэнты, якія вучыліся ў вышэйшых навучальных установах горада. Займалася друкаваннем і распаўсюджваннем беларускіх выданняў, у тым ліку і тых, што выпускаліся за мяжой, пошукам сродкаў для выдання беларускай літаратуры ў Расіі. Фінансавую і арганізацыйную падтрымку аказвалі ёй браты Кастравіцкія. Мела цесныя сувязі з прыхільнікамі беларускай кнігі ў Варшаве і Кракаве. Выдала паэтычны зборнік «Вязанка» Я. Лучыны ў 1903 г. На гектографе былі надрукаваны зборнікі «Калядная пісанка» і «Велікодная пісанка». У 1902 г. члены арганізацыі спрабавалі выдаць нелегальную газету «Свабода» [7].

На змену «Кругу беларускай асветы і культуры» прыходзіць выдавецкая суполка «Загляне сонца і ў наша ваконца». Яна займаецца сістэматычным, планамерным выданнем беларускіх кніг. У гэтай вялікай, святой справе для беларусаў вызначальную ролю адыграў П. Этмах-Шыпіла. Ён падрыхтаваў да друку першы паэтычны зборнік Янкі Купалы «Жалейка» [8].

Значную ролю ў выдавецкай суполцы адыгрывалі Грыневіч, Іваноўскі, браты Луцкевічы і інш. Пачынаў тут сваю самаахвярную працу на ніве нацыянальнага адраджэння студэнт Пецярбургскага універсітэта Браніслаў Тарашкевіч, будучы аўтар першай граматыкі беларускай мовы [9].

У пачатку 1900-х—1910 гг. беларускія гурткі існавалі пры Ягелонскім універсітэце ў Кракаве, сярод студэнтаў сельскагаспадарчага інстытута горада Новаалександрыя (цяпер горад Пулавы (Польшча)), у Юр'еўскім (Тартускім) універсітэце, Гродзенскі навуковы гурток студэнтаў Пецярбургскага універсітэта, беларускае студэнцкае зямляцтва ў Варшаве, «Беларуская нацыянальная суполка» ў Глухаўскім настаўніцкім інстытуце і інш.

З канца XIX ст. стала пашырацца такая форма грамадскіх арганізацый, як перыядычныя з'езды спецыялістаў розных галін навукі, культуры і асветы.

У рабоце 13 з'ездаў расійскіх прыродазнаўцаў і ўрачоў, якія праходзілі ў розных гарадах, бралі ўдзел больш за 350 чалавек з 50 населеных пункаў Беларусі. Прадстаўнікі Беларусі ўдзельнічалі ў Мендзялееўскіх з'ездах, усерасійскіх з'ездах выкладчыкаў матэматыкі, метэаралагічных з'ездах і інш.

У 1909—1915 гг. дзейнічала Віленскае таварыства прыхільнікаў прыродазнаўства, а ў 1912—1916 гг. існавала Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. З 1914 г. выдавала часопіс «Известия» [10].

Беларускае адраджэнне, фарміраванне нацыянальнай свядомасці, дзеля чаго і працавалі шматлікія грамадска-асветныя аб'яднанні, былі б малаэфектыўныя, калі б людзі, у якіх спалучалася любоў да Радзімы і заможнасць, не дапамаглі святой справе матэрыяльна. На беларускую справу ахвяроўвалі свае сціплыя зберажэнні Б. Эпімах-Шыпіла, сям'я Іваноўскіх, пан Э. Вайніловіч і многія іншыя. Але найбольшы матэрыяльны ўнёсак зрабіла Магдаліна Радзівіл. Працяглы час яна была членам Мінскага таварыства дабрачыннасці, ахвяравала значную суму грошай сама і арганізавала ахвяраванні суседзяў на будаўніцтва шпіталю для бясплатнага лячэння бедных. Немалыя сумы яна перадала выдавецтву «Загляне сонца і ў наша ваконца», газеце «Наша ніва», у сваім маёнтку Жорнаўка арганізавала ў 1914 г. школу для сялянскіх дзяцей, дзе выкладанне вялося на беларускай мове [11].

Пачатак XX ст. стаў важнай прыступкай на шляху беларускага адраджэння. Намаганнямі самаахвярных беларусаў, найперш моладзі, быў створаны падмурак, на які побач са старэйшымі сталі маладыя. Разам яны імкнуліся стварыць сваю дзяржаву і былі блізка ад мэты. Не іх віна, што гэтая спроба не прынесла жаданых вынікаў.

ЛІТАРАТУРА

3. ЭГБ.— Мн: Беларуская Энцыклапедыя, 1999.— Т. 5.— С. 169
4. Там жа.— С. 169.
5. Там жа.— С. 299.
6. Семашкевіч Р. М. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе.— Мн.: БДУ, 1971.— С. 3.
7. Там жа.— С. 16—17.
8. ЭГБ.— Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1996.— Т. 3.— С. 177.
9. ЭГБ.— Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1997.— Т. 4.— С. 262.
10. Семашкевіч Р. М. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе.— Мн.: БДУ, 1971.— С. 80.
11. Ліс А. Браніслаў Тарашкевіч.— Мн.: Навука і тэхніка, 1966.— С. 18.
12. ЭГБ.— Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1966.— Т. 3.— С. 112.
13. Хурсік В. Белы лебедзь у промнях славы.— Мн.: Пейто, 2001.— С. 42, 46, 76.

УДК 321

В. С. Леоненко, доцент

# ОРГАНИЗАЦИОННОЕ СТАНОВЛЕНИЕ ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКИХ ОБЪЕДИНЕНИЙРЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В НАЧАЛЕ 90-Х ГГ. XX В.

The article analyzes the creation and activity of political parties of Belarus in the 90-ies (first halt) of the twentieth century.

Активный процесс преобразования общества, постепенный переход к рыночным отношениям и многообразию форм собственности, изменения в социальной структуре СССР не могли не повлиять на формирование многопартийности в Беларуси. Ее становление в начале 90-х гг. XX в. во многом было схоже своими идеологическими спорами о выборе путей развития страны с периодом возникновения политических партий в Беларуси конца XIX — нач. XX в. Разница была лишь в том, что ранее рассматрива-